Асобы

# «САКРЭТ У ТЫМ, КАБ АДЧУЦЬ СЯБЕ Ў РОЛІ ЗЛАЧЫНЦА»

## ГІСТОРЫЯ САПРАЎДНАГА СЫШЧЫКА

**Падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы Аляксандр АЛЯКСАНДРАЎ больш за дваццаць гадоў праслужыў ва ўпраўленні крымінальнага вышуку тады яшчэ УУС Мінгарвыканкама. Усё як ва ўсіх: найскладанейшыя справы, ненармаваны працоўны графік і пастаяннае інтэлектуальнае напружанне. Вось толькі спецыялізацыя нетыповая — злачынствы, якія датычацца сексуальнай сферы...**



### Самы малады лейтэнант у рэспубліцы

Але пра гэта пазней. Для пачатку вернемся ў 1969 год — юны Аляксандр Аляксандраў паступае ў школу міліцыі. Здавалася б, нічога незвычайнага, аднак у маладога чалавека не было ні медыцынскага заключэння аб прыдатнасці, ні адбытай службы ў войску, што тады было абавязкова, акрамя таго, ён быў студэнтам трэцяга курса ўніверсітэта — юрфака БДУ. Тым не менш аказаны давер юнак апраўдаў у поўнай меры — скончыў вучобу з адзнакай. І нават не думаў стрымліваць сваю старыннасць. Яшчэ падчас стажыроўкі адпрацоўваў цэлы дзень як сышчык, а ў начную змену заступаў як памочнік дзяжурнага.

Калі ва ўпраўленне прыехаў начальнік крымінальнага вышуку горада палкоўнік міліцыі Пётр Пяткоўскі, яму адразу ж далажылі аб старанным практыканце. І таму прапанавалі пасаду старшага інспектара па справах непаўналетніх у адным з раёнаў сталіцы.

— Я тады так расхваляваўся: толькі са школы міліцыі, а ўжо старшы інспектар. А быў я ў той час зусім далікатнага целаскладу, думаў, хто мне з дзецюкоў паверыць? Лепш з асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі, чым з непаўналетнімі. Дасведчанаму вязню ўсё роўна, хто менавіта перад ім сядзіць, ён ведае, што ад гэтага чалавека ў пэўнай ступені залежыць яго лёс. Таму часцей за ўсё думае, што і як сказаць і зрабіць, — успамінае Аляксандр Георгіевіч.

Тым часам старэйшыя калегі расхвальвалі маладога супрацоўніка больш за ранейшае, маўляў, у яго ж і вышэйшая адукацыя ёсць. Тады палкоўнік міліцыі Пётр Пяткоўскі запрасіў Аляксандра Аляксандрава да сябе ва ўпраўленне, дзе той адпрацаваў да сыходу ў адстаўку.

### Спачатку справа — спалохаюся потым

Аддзел па раскрыцці злачынстваў супраць жыцця і здароўя, гонару і годнасці асобы — менавіта так называлася структура, у якую трапіў мэтанакіраваны юнак. Пачынаў з барацьбы з вензахваральнасцю — падрабязна вывучаў гэту і сумежныя тэмы, а паступова стаў займацца ўсімі злачынствамі, звязанымі з сексуальнай сферай: распусныя дзеянні, гвалт, забойствы на сексуальнай глебе. Так, па амаль выпадковым збегу абставін, атрымаў сваю прафесійную спецыялізацыю.

Адной з самых складаных спраў у сваёй кар'еры Аляксандр Аляксандраў лічыць раскрыццё серыі згвалтаванняў дзяўчатак ад 9 да 13 гадоў. Шукалі вінаватых паўгода, хоць сышчык з самага пачатку быў упэўнены, што дзейнічаў адзін чалавек — дзеці па-рознаму ўспрымаюць, а значыць, і апісваюць дарослых.

У перыяд затрымання злачынца Аляксандру Георгіевічу давялося не спаць трое сутак. Допыт ішоў усю ноч. Пасля таго як усё скончылася, у кабінет да знясіленага сышчыка прыйшлі бацькі з дзецьмі, якія казалі толькі адно слова «дзякуй» і моўчкі кланяліся. «Дзеля такіх момантаў і варта працаваць», — упэўнены падпалкоўнік.

Спраўляцца з пастаянным стрэсам дапамагала ўменне абстрагавацца і «позняе запальванне на страх». Аляксандр Георгіевіч успамінае два паказальныя выпадкі. Яшчэ падчас стажыроўкі яго адправілі разам з двума сяржантамі на выклік: п'яны мужчына з сякерай ганяецца за жонкай і дзіцем. На шчасце, да прыезду міліцыі яны паспелі схавацца ў суседзяў, а мужчына зачыніўся ў сваёй кватэры і заснуў. Дзверы ламаць не выпадала — усё ж яго складана было назваць узброеным.



Тады юны супрацоўнік праз суседскі балкон, адлегласць да другога была, між іншым, паўтара метра, пералез у кватэру да дэбашыра, абясшкодзіў яго і адчыніў дзверы калегам. Праўда, пасля гэтага ішоў ужо на ватных нагах: паверх дзявяты, а Аляксандр Георгіевіч, па ўласным прызнанні, з дзяцінства баіцца вышыні.

— Другі выпадак адбыўся яшчэ раней. Школа міліцыі, практычны занятак па судовай медыцыне — паход у морг. Тэарэтычна ўсё ведалі, як гэта будзе адбывацца, але калі пачалося ўскрыццё, лёгкі шум — і за маёй спінай пуста. Засталіся толькі трое, астатнія выскачылі. А мы распытвалі, што, чаму і як. Трэба разумець, што гэта праца, — гаворыць адкрыта Аляксандр Георгіевіч.

І ўсё ж былі сітуацыі, якія маглі закрануць, здавалася б, непрабіўную браню сышчыка. Выпадкова кінуты погляд на труп шасцігадовага хлопчыка ці мужчына, які ляжыць у лужыне крыві, толькі-толькі выпусціўшы апошні ўздых.

— Памятаю свае думкі ў той момант: яшчэ пяць хвілін таму гэты чалавек жыў, кагосьці любіў, пра штосьці марыў, а цяпер — усё. Даводзілася такія думкі выцясняць са свядомасці, — расказвае падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы.

### «Ніколі не крычаў, але затрыманыя плакалі»

Па словах Аляксандра Георгіевіча, у працы яму вельмі дапамагаў не толькі прафесійны і жыццёвы вопыт, але і вывучэнне псіхалогіі. У хатняй бібліятэцы знакамітага сышчыка больш за паўтары тысячы кніг, значная доля з іх па прафесіі.

— Уменне паставіць сябе на месца злачынца называецца інтэлектуальным аднаўленнем. Памятаю, у Ленінскім раёне быў выпадак згвалтавання. Прайшло больш за тыдзень — не раскрыты, запрасілі на дапамогу мяне. Я схадзіў на месца злачынства, пагутарыў з пацярпелай і даў указанне: паставіць на прыпынку двух чалавек, бо аб 11 гадзіне з'явіцца злачынец. Мае словы не ўспрынялі сур'езна: навошта яму вяртацца? Назаўтра я ўсё-ткі настаяў на сваім і яго сапраўды там затрымалі. На допыце ён катэгарычна адмовіўся расказваць пра злачынства — сорамна, бо сам намеснік сакратара камсамольскай арганізацыі курса і камісар студэнцкага атрада. Тады пачаў расказваць я — ва ўсіх падрабязнасцях, як у яго ўзнікла задума, як ён рыхтаваўся, як ён ажыццявіў гэта, чаму сышоў, навошта вярнуўся. Ён уважліва слухаў і толькі са здзіўленнем запытаў: «Вы што, там былі?» А я ўсяго толькі паставіў сябе на яго месца з улікам усіх абставін, — раскрывае прафесійныя сакрэты Аляксандр Аляксандраў.

Такі падыход даваў свае вынікі. Напрыклад, у 1980-х, калі па ўсёй краіне назіраўся рост згвалтаванняў, у Мінску іх было здзейснена усяго 16 за год і ўсе раскрытыя. І гэта — сіла слова, бо з пісталета Аляксандр Георгіевіч, па ўласным прызнанні, падчас працы не страляў ні разу: пагражаў, так, але не страляў нават у паветра. У яго здольнасці верылі настолькі, што часам чакалі, што аднаго погляду на месца злачынства будзе дастаткова, каб назваць вінаватага. Ледзь не так было, калі Аляксандра Георгіевіча запрасілі на дапамогу ў Мінскі раён. Меркавалі, што забойства адбылося на сексуальнай глебе. Аднак сышчык хутка зразумеў, што справа ў іншым, і даў падрабязную характарыстыку злачынца: хлопец, які з дзяцінства здзекаваўся з жывёл, нефармальны лідар, які хоча дамагчыся найвышэйшага аўтарытэту, прычым біў не ён адзін, прымушаў гэта рабіць яшчэ некалькіх людзей. Забойцу затрымалі праз тры дні — апісанні цалкам супалі з рэчаіснасцю.

— Ведаеце, падчас працы я ніколі не падвышаў голас. Пры гэтым затрыманыя часта плакалі. Я проста абмалёўваў ім карціну будучага жыцця і ўвесь жах таго, што яны нарабілі. І заўсёды кіраваўся адзіным прынцыпам — за мной дзяржава, за мной закон, — падсумаваў Аляксандр Георгіевіч.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*


**УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 14.12.2017 г. по продаже имущества, принадлежащего Керимовой Д. С.**

Легковой хэтчбэк «БМВ 116i», 2006 г. в., 1.6 бензин, Кузов: WBAUF11050PT97875, начальной стоимостью 6 840 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел./факс: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА №1221395-1221399, по ОСГО ВТС РБ серии ВВ №2356469-2356470, карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY 07 №13436890, №09687230 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным в связи с утерей**.

УНП 100357923

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:

– «Квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» формы 1-СУ серии СВ №№0548709, 0548721, 0555826;

– полисы «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) формы 2РН, 2РП серии АК №№0124009, 0127454;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№0959551, 0969442, 1005415, 1647841, 1341632, 1501825, 1562103, 1562178, 1562179, 1562180, 1587391, 1587392, 1587400, 1587401, 1639438, 1639471.

УНП 100782388

**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому Акционерному Обществу «Черейщина» (УНП 300039150)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Комбайн картофелеуборочный полуприцепной ПКК-2-02, 2006 года выпуска, начальная цена – 6 499,00 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Лепельский р-н, аг. Черейщина (территория хозяйства) |
| Место, дата и время проведения торгов | 15.12.2017 г. в 12.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610424, (8033) 6879148 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 14.12.2017 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому Акционерному Обществу «Лепельагросервис» (УНП 300590110)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-13213, площадь – 3188,5 кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, начальная цена – 51 390,00 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | г. Лепель, ул. Партизанская, 13А/9 |
| Место, дата и время проведения торгов | 19.12.2017 г. в 12.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610424, (8033) 6879148 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 18.12.2017 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

**Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому Акционерному Обществу «Жукнево» (УНП 300011620)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1. Лот №1 Автомобиль Шевроле Нива 212300, 2008 г. в., гос. №4912 BI2, состояние условно-пригодное начальная цена – 1 197,60 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Толочинский р-н, д. Жукнево |
| Место, дата и время проведения торгов | 19.12.2017 г. в 15.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 610424, (8033) 6879148 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 18.12.2017 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |